Отдел идеологической работы, культуры и по делам молодежи Витебского горисполкома

*Форма зацверджана Пастановай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2016 года № 90 "Аб устанаўленні формы ахоўнага абавязацельства"*

# АХОЎНАЕ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВА

№ 03-031 2015 / 0181 ад 16.02.2018

1. Матэрыяльная гісторыка-культурная каштоўнасць (далей – гісторыка-культурная каштоўнасць): **Забудова вул. Талстога**

(назва згодна з Дзяржаўным спісам гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь)

2. Шыфр **213Г000087**

3. Месца знаходжання гісторыка-культурнай каштоўнасці **г. Віцебск, вул. Талстога, 1**

4. Катэгорыя **3**

5.Назва прававога акта **Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 14.05.2007 г. № 578**

(назва прававога акта, якім нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці, і дзяржаўнага органа, які яго прыняў, дата і нумар)

**"Аб статусе гісторыка-культурных каштоўнасцей"**

6. Форма ўласнасці, у якой знаходзіцца гісторыка-культурная каштоўнасць **прыватная**

(дзяржаўная (рэспубліканская або камунальная), прыватная)

7. Уласнік (карыстальнік) гісторыка-культурнай каштоўнасці, землекарыстальнік, на зямельным участку якога размешчана нерухомая гісторыка-культурная каштоўнасць (далей – уласнік (карыстальнік)) **Унітарнае камунальнае будаўніча-мантажнае прадпрыемства "Дзяржбудуніверсал"**

(поўная назва юрыдычнай асобы або прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі такое маецца) фізічнай асобы, у тым ліку індывідуальнага прадпрымальніка)

8. Уласнік (карыстальнік) абавязаны:

8.1. забяспечваць захаванасць гісторыка-культурнай каштоўнасці;

8.2. захоўваць у цэласнасці калекцыю гісторыка-культурных каштоўнасцей;

8.3. забяспечваць доступ да гісторыка-культурнай каштоўнасці спецыялістам, якія па даручэнні (узгадненні) Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь маюць права на яе вывучэнне;

8.4. прадстаўляць грамадзянам па дамоўленасці з мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі базавага тэрытарыяльнага ўзроўню доступ да гісторыка- культурнай каштоўнасці на тэрмін не менш за шэсць месяцаў на працягу кожных дзесяці гадоў;

8.5. паведамляць у мясцовы выканаўчы і распарадчы орган базавага тэрытарыяльнага ўзроўню аб акалічнасцях, якія пагражаюць захаванню гісторыка-культурнай каштоўнасці, не пазней за тры каляндарныя дні з дня выяўлення гэтых акалічнасцей;

8.6. забяспечыць усталяванне на нерухомай гісторыка-культурнай каштоўнасці ахоўнай дошкі і складанне пашпарта гісторыка-культурнай каштоўнасці;

8.7. пры пераходзе права ўласнасці або іншага рэчавага права на гісторыка-культурную каштоўнасць, права ўласнасці, права пажыццёвага спадчыннага валодання, пастаяннага або часовага карыстання або арэнды (субарэнды) на зямельны ўчастак, на якім размешчана нерухомая гісторыка-культурная каштоўнасць, не пазней за пяць каляндарных дзён з дня пераходу права перадаць пашпарт гісторыка-культурнай каштоўнасці новаму ўласніку (карыстальніку).

9. Уласніку (карыстальніку) вядома аб тым, што:

9.1. навукова-даследчыя і праектныя работы на гісторыка-культурнай каштоўнасці могуць выконвацца толькі пасля атрымання дазволу на выкананне навукова-даследчых і праектных работ на гісторыка-культурнай каштоўнасці, які выдаецца Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь юрыдычным асобам, грамадзянам, у тым ліку індывідуальным прадпрымальнікам, у адпаведнасці з заканадаўствам аб адміністрацыйных працэдурах;

9.2. забараняецца: знішчаць гісторыка-культурную каштоўнасць; дапускаць прычыненне шкоды, змяненне гісторыка-культурнай каштоўнасці, выконваць навукова-даследчыя і праектныя работы без дазволу на выкананне навукова-даследчых і праектных работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях; мяняць месца знаходжання (захоўвання), умовы ўтрымання і выкарыстання гісторыка-культурнай каштоўнасці без узгаднення з мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі базавага тэрытарыяльнага ўзроўню, за выключэннем гісторыка-культурных каштоўнасцей, якія ўключаны ў Музейны фонд Рэспублікі Беларусь; вывозіць рухомую гісторыка-культурную каштоўнасць з Рэспублікі Беларусь на пастаяннае захоўванне; перадаваць гісторыка-культурную каштоўнасць у валоданне і (або) карыстанне Узброеным Сілам Рэспублікі Беларусь, іншым войскам і воінскім фарміраванням Рэспублікі Беларусь;

9.3. усе віды работ у зонах аховы нерухомых гісторыка-культурных каштоўнасцей выконваюцца ў межах патрабаванняў рэжымаў утрымання і выкарыстання гэтых зон аховы, вызначаных праектам зон аховы нерухомай гісторыка-культурнай каштоўнасці, які зацвярджаецца Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь, калі іншае не прадугледжана Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб культуры;

9.4. праектная дакументацыя на выкананне земляных, будаўнічых, меліярацыйных і іншых работ, ажыццяўленне іншай дзейнасці на тэрыторыі археалагічных аб'ектаў, за выключэннем помнікаў археалогіі, узгадняецца з Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі ў адпаведнасці з заканадаўствам аб адміністрацыйных працэдурах;

9.5. праектная дакументацыя на выкананне земляных, будаўнічых, меліярацыйных і іншых работ, ажыццяўленне іншай дзейнасці на помніках археалогіі ўзгадняецца з Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з заканадаўствам аб адміністрацыйных працэдурах;

9.6. для гісторыка-культурнай каштоўнасці вызначаны наступныя індывідуальныя ўмовы ўтрымання і выкарыстання захаванне знешняга выгляду фасадаў і формы аконных рам, характэрных

(вызначаюццаадметныя вартасці, элементы, дэталі, археалагічныя аб'екты і інш., якія падлягаюць ахове асобна, і (або) умовы выкарыстання гісторыка-культурнай каштоўнасці)

для помніка, у выпадку, калі аб'ект будзе задзейнічаны ў прадпрымальніцкай дзейнасці, якая можа аказваць негатыўнае ўздзеянне на гісторыка-культурную каштоўнасць, уласнік (карыстальнік) павінен выконваць патрабаванні дзеючага заканадаўства пра ажыццяўленне абавязковых адлічэнняў за такую дзейнасць.

9.7. устаноўлены наступны парадак прадстаўлення доступу да гісторыка-культурнай каштоўнасці грамадзянам _______________ – _______________

(па дамоўленасці з мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі базавага тэрытарыяльнага ўзроўню)

9.8. пры ажыццяўленні дзейнасці на тэрыторыі нерухомых гісторыка-культурных каштоўнасцей і ў зонах іх аховы не павінна дапускацца пагаршэнне ўмоў успрымання гэтых гісторыка-культурных каштоўнасцей, у тым ліку стварэнне перашкод для візуальнага ўспрымання іх аб'ёмна-прасторавых асаблівасцей, элементаў і дэталей архітэктурнага дэкору –;

9.9. пры будаўніцтве капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў) на тэрыторыі нерухомых гісторыка-культурных каштоўнасцей і ў зонах іх аховы, а таксама пры размяшчэнні на гэтай тэрыторыі і ў гэтых зонах аховы нестацыянарных аб'ектаў гандлю і нестацыянарных аб'ектаў грамадскага харчавання павінны ўлічвацца традыцыйныя сілуэт і planіровачная структура населенага пункта;

9.10. сродкі вонкавай рэкламы, якія размяшчаюцца на нерухомых гісторыка-культурных каштоўнасцях, іх тэрыторыях і ў зонах іх аховы, не павінны ствараць перашкоды для візуальнага ўспрымання аб'ёмна-прасторавых асаблівасцей, элементаў і дэталей архітэктурнага дэкору гэтых нерухомых гісторыка-культурных каштоўнасцей;

9.11. на помніках архітэктуры сродкі вонкавай рэкламы павінны размяшчацца, як правіла, асобнымі літарамі, знакамі і (або) іншымі выявамі.

10. У выпадку надзвычайных сітуацый або ўзброенага канфлікту, у тым ліку за межамі Рэспублікі Беларусь _______________ – _______________

(парадак падрыхтоўкі і правядзення эвакуацыі гісторыка-культурных каштоўнасцей, якім пагражае знішчэнне)

11. Уласнік (карыстальнік) абавязуецца выконваць вызначаныя ў дадзеным ахоўным абавязацельстве ўмовы ўтрымання і выкарыстання гісторыка-культурнай каштоўнасці, а таксама патрабаванні па забеспячэнні яе захавання.

12. Невыкананне ўласнікам (карыстальнікам) узятых на сябе абавязацельстваў, вызначаных дадзеным ахоўным абавязацельствам, цягне за сабой адміністрацыйную або крымінальную адказнасць у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

13. Уласнік (карыстальнік) **Унітарнае камунальнае будаўніча-мантажнае прадпрыемства**

(назва юрыдычнай асобы, пасада, прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі такое маецца) кіраўніка юрыдычнай асобы або прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі такое маецца)

**"Дзяржбудуніверсал" у асобе дырэктара Казыра Аляксандра Сцяфанавіча, дзеючага на падставе Статута**

фізічнай асобы, у тым ліку індывідуальнага прадпрымальніка, дадзеныя дакумента, якія сведчаць пра асобу)

14. Адрас месца знаходжання (месца жыхарства) уласніка (карыстальніка) **г. Віцебск, вул. Талстога, 1**

15. Тэлефон уласніка (карыстальніка) +375 212 55 83 03

16. Подпіс уласніка (карыстальніка) _______________

(для юрыдычнай асобы М.П.)

17. Бялецкі А.І. галоўны спецыяліст аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага гарвыканкама

(прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі такое маецца) асобы, якая запоўніла ахоўнае абавязацельства)

18. Ахоўнае абавязацельства запаўняецца ў 2 экзэмплярах.

19. Экзэмпляр Унітарнае камунальнае будаўніча-мантажнае прадпрыемства «Дзяржбудуніверсал»

(назва (імя) уласніка (карыстальніка)